нормативка.by Подготовлено с использованием ИПС «Нормативка.by»

# ПАСТАНОВА КАБІНЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

3 красавіка 1996 г. № 236

# Аб пераўтварэнні Фонду фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь у Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў

## Изменения и дополнения:

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 31 декабря 1999 г. № 2079 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2000 г., № 7, 5/2380) <C29902079>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 20 марта 2003 г. № 370 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2003 г., № 37, 5/12170) <C20300370>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 21 сентября 2004 г. № 1172 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2004 г., № 154, 5/14879) <C20401172>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 5 июня 2017 г. № 425 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 14.06.2017, 5/43819) <C21700425>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 28 февраля 2019 г. № 138 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 05.03.2019, 5/46217) <C21900138>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 12 марта 2021 г. № 145 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 16.03.2021, 5/48874) <C22100145>

Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Пераўтварыць Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь у Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў.

1[1]. Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў з’яўляецца дзяржаўнай некамерцыйнай арганізацыяй, якая не мае членства, знаходзіцца ў падпарадкаванні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і дзейнічае на падставе Статута, які зацвярджаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Органамі Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў з’яўляюцца навуковы савет, выканаўчая дырэкцыя і папячыцельскі савет.

Склады навуковага савета і папячыцельскага савета Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў зацвярджаюцца Прэзідыумам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі тэрмінам на пяць гадоў.

1[2]. Сродкі Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў фарміруюцца за кошт:

сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія ва ўстаноўленым парадку выдзяляюцца Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на арганізацыю і правядзенне фундаментальных даследаванняў, забеспячэнне статутнай дзейнасці, ажыццяўленне міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, падрыхтоўку і выданне навукова-тэхнічнай і навукова-метадычнай літаратуры (у тым ліку перыядычных выданняў), правядзенне навуковых і навукова-практычных мерапрыемстваў (канферэнцый, семінараў, сімпозіумаў, выставак, іншых мерапрыемстваў);

добраахвотных адлічэнняў (узносаў) арганізацый, грамадскіх арганізацый (аб’яднанняў) і асобных грамадзян;

мэтавых узносаў заказчыкаў, зацікаўленых у правядзенні фундаментальных навуковых даследаванняў па канкрэтных напрамках;

працэнтаў за выкарыстанне грашовых сродкаў, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку (за выключэннем асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту);

іншых паступленняў і даходаў, атрыманых ад прадпрымальніцкай дзейнасці, не забароненай заканадаўствам.

Сродкі названага фонду на фінансаванне і апрабацыю вынікаў фундаментальных, у тым ліку арыентаваных фундаментальных, навуковых даследаванняў у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, грамадскіх і гуманітарных навук накіроўваюцца па выніках адкрытых конкурсаў, уключаючы міжнародныя.

2. Утратил силу.

3. Утратил силу.

4. Устанавіць, што:

утрыманне выканаўчай дырэкцыі Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў і забеспячэнне напрамкаў дзейнасці названага фонду, прадугледжаных яго Статутам, уключаючы фінансаванне рэалізацыі асобных праектаў навуковых даследаванняў на конкурснай аснове, ажыццяўляюцца за кошт сродкаў гэтага фонду ў адпаведнасці з зацверджанымі ва ўстаноўленым парадку бюджэтным каштарысам, каштарысам даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў фонду;

конкурсны адбор праектаў фундаментальных даследаванняў, фінансаванне рэалізацыі якіх плануецца цалкам або часткова за кошт дзяржаўных сродкаў дадзенага фонду, за выключэннем праектаў, фінансаванне рэалізацыі якіх плануецца за кошт грантаў для маладых вучоных, ажыццяўляецца названым фондам з улікам вынікаў дзяржаўнай навуковай экспертызы;

экспертыза пададзеных на конкурс праектаў фундаментальных даследаванняў, фінансаванне рэалізацыі якіх плануецца за кошт сродкаў названага фонду, што не адносяцца да дзяржаўных, а таксама праектаў, фінансаванне рэалізацыі якіх плануецца за кошт дзяржаўных сродкаў гэтага фонду шляхам выдзялення грантаў для маладых вучоных, ажыццяўляецца запрошанымі экспертамі на платнай аснове.

Аплата працы запрошаных экспертаў па праектах, фінансаванне рэалізацыі якіх плануецца цалкам або часткова за кошт дзяржаўных сродкаў дадзенага фонду шляхам выдзялення грантаў для маладых вучоных, ажыццяўляецца ў памеры 30 працэнтаў ад базавай велічыні за гадзіну з улікам фактычна затрачанага кожным экспертам часу на правядзенне экспертызы праектаў.

5. Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў двухмесячны тэрмін распрацаваць і зацвердзіць па ўзгадненню з Міністэрствам фінансаў і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны парадак аплаты працы экспертаў за правядзенне экспертызы пададзеных на конкурс праектаў фундаментальных даследаванняў.

6. Утратил силу.

7. Прызнаць страціўшымі сілу:

пастанову Савета Міністраў БССР ад 8 мая 1991 г. № 176 «Аб Фондзе фундаментальных даследаванняў Беларускай ССР» (ЗП БССР, 1991 г., № 15, арт. 159), акрамя абзаца першага пункта 1;

распараджэнне Савета Міністраў БССР ад 29 мая 1991 г. № 295р;

пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 1992 г. № 230 «Аб унясенні змяненняў у пункт 6 пастановы Савета Міністраў БССР ад 8 мая 1991 г. № 176» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 12, арт. 207);

пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 чэрвеня 1992 г. № 386 «Аб унясенні змяненняў у склад савета Фонду фундаментальных даследаванняў» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 18, арт. 335).

**Намеснік Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь** **С.Лінг**